# МЕДЫЯТЭКСТ ЯК ПРАДУКТ РАБОТЫ З ЦЫТАТНЫМ МАТЭРЫЯЛАМ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ВА ЎМОВАХ АКТУАЛЬНАСЦІ ДЫДАКТЫКІ СЕТКАВАГА ЎРОКА І ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ)

***Панкратава Алена Яўгеньеўна***,
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры, ДУА «Мінскае гарадское кадэцкае вучылішча»*
*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

Разглядаюцца медыйныя формы вучэбнай работы з цытатным матэрыялам мастацкіх твораў на ўроках беларускай літаратуры, актуальныя ва ўмовах дыдактыкі сеткавага ўрока і фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, медыятэкст, цытатны медыяпраект, цытатны партрэт кінагероя, чытацкая пісьменнасць, інтэрпрэтацыя літаратурнага твора.

Ва ўмовах сеткавага навучання, калі вучням адказы на многія стандартныя пытанні і заданні можна знайсці ў інфармацыйнай прасторы імгненна, набор традыцыйных вучэбных заданняў па беларускай літаратуры паступова страчвае сваю дыдактычную функцыю, найбольшую актуальнасць і адукацыйную запатрабаванасць набываюць заданні, «арыентаваныя на практычную дзейнасць і сувязь з паўсядзённым жыццём», «накіраваныя на выяўленне асобасных адносін вучняў да мастацкага твора, яго герояў», «якія дазваляюць звязаць матэрыял, які вывучаецца, з асабістым сацыяльным вопытам і ўяўленнямі пра сацыяльнае жыццё і паводзіны людзей у грамадстве» [1].

У кантэксце дадзеных рэкамендацый бачыцца актуальным стварэнне медыятэксту на ўроках беларускай літаратуры як спосабу вучэбнай дзейнасці. Стварэнне медыятэксту як спосаб вучэбнай дзейнасці ўжо даказала сваю эфектыўнасць праз магчымасці не адыходзіць ад асноўных дыдактычных задач урока пры рабоце з тэкстам [5], спрыяць фарміраванню камунікатыўных кампетэнцый [10], інтэграцыйны патэнцыял (з вучэбнымі прадметамі «Інфарматыка», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» [6], «Гісторыя Беларусі» [3], станоўчы матывацыйны складнік вучэбнай дзейнасці [4]. Актуальнасць скарыстання медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці ў фармаце сеткавага ўрока абумоўленая доступам да разнастайных медыярэсурсаў, інтэрактыўнасцю, магчымасцю рэалізацыі крэатыўных ідэй, творчых здольнасцей, калектыўнай праектнай дзейнасці [8]. Скарыстанне медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці дае шырокія магчымасці і для фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў, асабліва ў фармаце сеткавага ўрока [7]. Ва ўмовах жа сучаснай праблемы матывацыі вучняў да чытання мастацкіх тэкстаў па беларускай літаратуры і фарміравання іх чытацкай пісьменнасці асаблівую актуальнасць набывае работа з сэнсавымі адзінкамі літаратурнага твора – цытатамі. Сістэмная мэтанакіраваная работа з цытатамі

фарміруе свядомую скіраванасць чытацкіх інтарэсаў, устойлівую цікавасць да чытання, начытанасць, рознабаковасць, сістэмнасць, якія з'яўляюцца асноўнымі задачамі літаратурнай адукацыі і паказчыкамі чытацкай пісьменнасці [2]. Практычная дзейнасць настаўніка паказвае, што назіраецца дэфіцыт прапанавых метадычнай літаратурай сучасных медыйных форм работы з цытатным матэрыялам, спрыяльных для правядзення сеткавага ўрока беларускай літаратуры. У кантэксце абазначанай праблемы можна прапанаваць некалькі спосабаў вучэбнай дзейнасці.

Цытатны партрэт кінагероя.

Адной з форм інтэрпрэтацый літаратурнага твора з'яўляюцца яго кінаверсіі, скарыстанне фрагментаў якіх метадычна працуе на розных этапах работы з літаратурным творам [9]. Прымяняць кінаверсіі мастацкіх твораў прапануюць і аўтары вучэбных дапаможнікаў новага пакалення [6]. Дадзеная форма работы прадугледжвае падбор цытат для вобраза літаратурнага героя, прапанаванага кінаінтэрпрэтацыяй літаратурнага твора. У працэсе такой работы ажыццяўляецца параўнанне літаратурнага і кінапартрэта героя.




**Малюнак 1. Цытатны партрэт кінагероя: фрагмент калектыўнага медыяпраекта вучняў IX класа па аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і мастацкім фільме «Дикая охота короля Стаха» (рэж. Валерый Рубінчык)**

Для работы з цытатнай характарыстыкай кінагероя ў кантэксце фарміравання чытацкай пісьменнасці мэтазгодна прапанаваць наступныя заданні:

– паназірайце, якія рысы характару героя прасочваюцца ў яго літаратурным партрэце і ў кінавобразе;

– параўнайце знешнасць героя ў кінафільме і яго літаратурны партрэт, знайдзіце агульнае і адрозненні;

– сфармулюйце, наколькі важныя адрозненні, якія вы заўважылі, для разумення характару героя;

– назавіце эмоцыі, апісаныя пісьменнікам, якія перажывае ў дадзеным эпізодзе кінагерой;

– зрабіце самастойнае апісанне знешнасці (характару) кінагероя і параўнайце яго з тым, як гэта зрабіў аўтар літаратурнага твора.

Цытатны медыяпраект як спосаб інтэрпрэтацыі літаратурнага твора.

У выніку работы над літаратурным цытатным медыяпраектам вучні прадстаўляюць прэзентацыі, плакаты, коміксы, відэавершы, буктрэйлеры, газеты, анімацыйныя фільмы і нават невялікія цытатныя бізнес-праекты, створаныя ў рамках сеткавага ўрока праз онлайн- сэрвісы, што прадугледжваюць сумесную вучэбную работу.




**Малюнак 2. Калектыўны медыяпраект (серыя закладак для кніг з цытатамі з казак У. Караткевіча, ілюстрацыі М. Купавы)**

Літаратурны медыяпраект не абавязкова мае пэўную структуру, ён заключаюцца ў стварэнні цікавага, крэатыўнага праекта, арыентаванага на фарміраванне чытацкай пісьменнасці пры дапамозе літаратурнага тэксту. Асаблівасць арганізацыі работы над стварэннем медыяпраекта заключаецца ў свабодзе выбару формы прэзентацыі літаратурнага твора. Абавязковая ўмова заключаецца ў тым, каб за аснову праекта былі ўзяты цытаты, што і тлумачыць эфектыўнасць дадзенай формы вучэбнай дзейнасці. Звычайна прэзентацыю (творчую форму інтэрпрэтацыі) твора або цыкла твораў вучні рыхтуюць к заключным заняткам па тэме або раздзеле (цыкл апавяданняў Раісы Баравіковай «Казкі астранаўта»). Калі мэта ўрока літаратуры ўбірае ў сябе інтэграцыйныя задачы, варта загадзя дапамагчы вучням з адборам матэрыялу. Да прыкладу, калі плануецца стварэнне інтэграванага літаратурнага медыяпраекта («Жыціе Еўфрасінні Полацкай»), то мэтазгодна прапанаваць вучням падбор візуальнага матэрыялу з мэтай знаёмства з творчасцю пэўнага аўтара (да прыкладу, мастака Арлена Кашкурэвіча), і такім чынам спалучыць

веды па беларускай літаратуры і беларускім выяўленчым мастацтве. Калі ж мэта праекта больш глабальная, магчыма спалучэнне літаратуры (цытатнага матэрыялу) з рознымі відамі мастацтва [3].

Работа над літаратурнымі медыяпраектамі спрыяе авалоданню вучнямі ўніверсальнымі спосабамі дзейнасці, уменню не толькі аналізаваць, але і інтэрпрэтаваць літаратурны тэкст. Веды па літаратуры, замацаваныя ўзаемасувязямі, у большай ступені набываюць эмацыйную і пазнавальную значнасць, а новыя сэнсавыя характарыстыкі, якія з'яўляюцца ў час работы над медыяпраектам, спрыяюць творчай інтэрпрэтацыі, становяцца арыенцірам у мастацка-творчай дзейнасці вучняў.




**Малюнак 3. Прыклад скарыстання цытат пры стварэнні буктрэйлера да паэмы «Тарас на Парнасе»**

Інтэрактыўная работа з цытатамі ў электронных рабочых лістах.

У працоўным лісце ўрока літаратуры, арыентаванага на фарміраванне чытацкай пісьменнасці, у выглядзе заданняў могуць адлюстроўвацца ключавыя этапы разумення літаратурнага твора праз непасрэдную працу вучня з цытатамі. Сфармуляваныя ў рабочым інтэрактыўным лісце, такія заданні прыдатныя як для індывідуальнай, так і для групавой форм вучэбнай дзейнасці ва ўмовах сеткавага ўрока:

– складзіце цытатную характарыстыку літаратурнага героя, параўнальную характарыстыку літаратурных герояў (Георгій Марчук. Казка «Чужое багацце»);

– спазнайце героя па рэпліцы (Казка «Музыкі»);

– складзіце цытатны план літаратурнага тэксту (Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»);

– адкажыце на пытанні па змесце твора пры дапамозе цытат (Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных»);

– падбярыце цытаты да ілюстрацый (Уладзімір Караткевіч. Казка «Кацёл з каменьчыкамі»);

– дайце тлумачэнне наступным паняццям, зыходзячы з тэксту літаратурнага твора (казка «Залаты птах»);

– працягніце цытаты, у якіх заключана галоўная думка твора (У. Караткевіч. Казка «Нямоглы бацька»);

– выпішыце ключавую цытату, у якой заключана галоўная думка літаратурнага твора (Уладзімір Караткевіч. Казка «Лебядзіны скіт»);

– пры дапамозе цытат абазначце ідэю, праблематыку, галоўныя вобразы літаратурнага твора (паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»).

Ва ўмовах сеткавага навучання электронны працоўны ліст можа служыць адначасова і сродкам дастаўкі электроннага кантэнту (ілюстрацый, скрыншотаў з мультыплікацыйных, мастацкіх, дакументальных фільмаў, рэпрадукцый, фота і г. д.), уключаць не толькі тэорыю, але і неабходныя падказкі, актыўныя спасылкі на літаратурныя творы, што робіць работу з цытатамі больш разнастайнай і прадуктыўнай.

Цытатны інтэрактыў у Google Jamboard.

Інтэрактыўная онлайн-дошка Google Jamboard дае шырокія магчымасці для групавых форм работы ў фармаце сеткавага ўрока, дазваляе адначасова працаваць у рэжыме рэальнага часу вялікай колькасці ўдзельнікаў.




**Малюнак 4. Цытатны інтэрактыў па раздзеле «Сучасная беларуская паэзія», сэрвіс Google Jamboard.**

Вучні ў групах могуць ствараць кантэнт, друкаваць, пісаць, рэдагаваць тэксты, маляваць, загружаць выявы і працаваць на гэтых выявах. Асабліва карысная функцыя – гэта магчымасць ствараць і перамяшчаць стыкеры, бо з іх дапамогай можна ствараць заданні на класіфікацыю цытат у пэўнай адпаведнасці. Сэрвіс Google Jamboard дае магчымасць спалучыць візуальнае

ўспрыманне з сістэматызацыяй цытатнага матэрыялу, што эфектыўна працуе на розных этапах работы з літаратурным тэкстам.

Цытатны Quiz Bot.

Нашто ж на зямлі<br>
Сваркі і звадкі, боль і горыч,<br>
Калі ўсе мы разам ляцім<br>
Да зор ?

Хто з’яўляецца аўтарам агульнавядомых радкоў, прыгаданых вышэй? Янка Купала? Якуб Колас? Ці Максім Багдановіч? Засваенне падобнага роду ведаў патрабуе сістэмы, рэгулярнага паўтарэння цытатнага матэрыялу, а для выканання гэтай задачы – зручнага сэрвісу, які дазваляе ажыццяўляць актуалізацыю ведаў ці паўтарэнне аператыўна. Канструяванне цытатнага тэставага задання пры дапамозе Quiz Bot, сэрвісу Telegram, можа стаць вучэбнай задача ўрока абагульнення па пэўным раздзеле. Telegram дазваляе ствараць апытанні ў групах і каналах, якія можна выкарыстоўваць для любых вучэбных задач. Віктарыны - гэта асаблівы від апытанняў, у якім ёсць тлумачэнні і толькі адзін правільны адказ. Гэта робіць іх прыдатнымі для адукацыйных мэт. З дапамогай Quiz Bot (@quizbot) можна ствараць тэсты са мноствам пытанняў і дзяліцца імі. Бот дазваляе дадаць тэкст або выяву перад пытаннем, што асабліва актуальна для апытання па літаратуры.




**Малюнак 5. Фрагменты цытатнага тэставага задання ў Quiz Bot паводле драмы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», статыстыкі па выніках тэставай работы**

Не толькі выкананне (рэпрадуктыўны ўзровень), але і стварэнне тэставых заданняў (прадуктыўны, творчы ўзроўні) пры дапамозе экспрэс-сэрвісаў патрабуе разумення і навыку скарыстання літаратурнага тэксту, што

з’яўляецца галоўнымі паказчыкамі чытацкай пісьменнасці.

Такім чынам, ва ўмовах інфарматызацыі адукацыйнага працэсу, актуальнасці дыдактыкі сеткавага і дыстанцыйнага навучання стварэнне медыятэксту як прадукта вучэбнай работы з цытатным матэрыялам на ўроках беларускай літаратуры з’яўляецца сучасным эфектыўным спосабам навучання ў кантэксце фарміравання чытацкай пісьменнасці.

**Літаратура**


1. Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі ў 2021/2022 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://adu.by/. – Дата доступу: 07.11.2021.
2. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://edu.gov.by/. – Дата доступу: 07.11.2021.
3. Панкратава, А. Я. Адукацыйна-культурніцкі праект для вучняў 9 класа [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/sites/default/files/page/files/958_pankratava-jeufrasinnia-zaniatak.pdf – Дата доступу: 10.10.2021.
4. Панкратава, А. Я. Беларуская мова для «лічбавага» пакалення. Медыятэкст як сродак фарміравання станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ва ўмовах дапрофільнай падрыхтоўкі/ А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2019. – № 1.– С. 38-41.
5. Панкратава, А. Я. Выкарыстанне медыякантэнту вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры для 9 класа/ А. Я. Панкратава // Мова, літаратура і культура ў адукацыйнай прасторы Беларусі і Кітая: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: РІВШ, 2020. – С. 1962.
6. Панкратава А. Я. Магчымасці метадычнага напаўнення вучэбнага дапаможніка пры фарміраванні медыякампетэнцый вучняў праз сінтэз літаратуры і кінамастацтва (на прыкладзе вучэбнага дапаможніка «Беларуская літаратура 9 клас»: матэрыялы Міжнароднай канферэнцыі «MEDIAадукацыя: міжнародны досвед, практыка, перспектывы» (г. Мінск, 14 кастрычніка 2019 года) / Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, 2020. С. 225-228.
7. Панкратава, А. Я. Медыятэкст – сродак спасціжэння сэнсу літаратурнага твора / А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2019. – № 4– С. 30-33.
8. Панкратава, А. Я. Сямейны капітал: медыяпраект «Бабуліна навука, або смачна есці!». Фарміраванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў праз узаемадзеянне з прадстаўнікамі прабацькоўскага пакалення / А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2016. – № 6.
9. Панкратава, А. Я. Фарміраванне ў вучняў асабістага эмацыянальнага багажу. Цытатны партрэт кінагероя як прыём літаратурна-візуальнага аналізу мастацкага твора / А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2020. – № 8– С. 43-44.
10. Панкратава, А. Я. Школьны гурток: ад медыяспажыўцоў да медыястваральнікаў. Сродкі фарміравання нацыянальна-культурнай

ідэнтычнасці вучняў і іх камунікатыўных кампетэнцый / А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2016. – № 3. – С. 51-53.

## MEDIA TEXTAS A FORM OF WORK WITH QUOTES IN BELARUSIAN LITERATURE LESSONS (IN THE CONDITIONS OF THE RELEVANCE OF THE NETWORK LESSON DIDACTICS AND FORMATION OF READING LITERACY)

**A.Y. Pankratava,**

The possibilities of the media text as a form of educational work with quotations in the lessons of Belarusian literature in the context of the didactics of a network lesson and the formation of reading literacy are considered.

**Keywords:** Belarusian literature, book trailer, Google Jamboard, interpretation of a literary work, media text, quoted media project, quoted portrait of a movie hero, reading literacy, reading competencies, Quiz Bot, electronic worksheet.